

# Руслан КАЗЛОЎСКІ

---

Нарадзіўся 28 лістапада 1970 года ў горадзе Гродна. У 1978-1988 гг. вучыўся ў сярэдняй школе №21 г.Гродна. Адразу па сканчэнні школы з 1988 года па 1993 год - вучоба ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы на спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура. Руская мова і літаратура». Займаўся актыўнай грамадскай дзейнасцю, друкаваўся з навукова-папулярнымі артыкуламі на літаратуразнаўчую тэматыку і публіцыстычнымі нататкамі ў газеце «Гродзенскі ўніверсітэт», супрацоўнічаў з Гродзенскай абласной радыёстудыяй. У 1993 годзе скончыў факультэт беларускай філалогіі і культуры ГрДУ імя Янкі Купалы з адзнакай. Паводле размеркавання з 1993 года стаў працаваць выкладчыкам на кафедры беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

У 1999 г. скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры XX стагоддзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «Сучасная беларуская літаратура». У 2002 годзе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю (БДУ) і атрымаў вучоную ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці «Беларуская літаратура». Вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці «Літаратуразнаўства» нададзена ў 2006 годзе. За перыяд працы на кафедры беларускай

літаратуры ГрДУ імя Янкі Купалы з 1993 года па цяперашні час на кафедры беларускай філалогіі прайшоў пэўны шлях педагога і навукоўца-літаратара: выкладчык-стажор, выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт. Асноўныя накірункі навуковых даследаванняў: тэорыя малых жанраў беларускай прозы, рэгіянальная спецыфіка айчыннай літаратуры, беларуская фалькларыстыка. Удзельнічаў у шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, апублікаваў звыш ста навуковых і навукова-метадычных прац у галіне літаратуразнаўства і фалькларыстыкі ў Беларусі і па-за яе межамі.

З’яўляецца аўтарам дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ «Беларускі фальклор» (1999, у сааўтарстве з М.У.Мікулічам), «Славянскі фальклор» (1999, у сааўтарстве з М.У.Мікулічам), «Празаічная мініяцюра ў беларускай літаратуры» (2006), хрэстаматыі «Беларускі фальклор Гродзеншчыны: народны эпас, замовы, варажба» (2007), манаграфіі «Праз прызму часу: беларуская літаратура XX стагоддзя ў кантэксце навуковых даследаванняў» (2012, у сааўтарстве з П.К.Банцэвічам), артыкулаў у энцыклапедычных выданнях «Культура Беларусі», «Янка Купала», «Беларускі фальклор» і інш. Друкаваў уласныя празаічныя мініяцюры і вершы ў газеце «Гродзенскі ўніверсітэт» і калектыўным зборніку паэзіі «Россып» (2010), літаратуразнаўчыя і навукова-метадычныя артыкулы ў галіне вывучэння беларускай літаратуры ў часопісах «Роднае слова», «Маладосць», «Беларуская мова і літаратура», альманаху «На Нёманскай хвалі» і іншых часопісах і газетах. Перакладаў паэзію з польскай мовы на беларускую. На працягу больш за дваццаць гадоў супрацоўнічае з беларускім тэлебачаннем: Аблтэлерадыёкампаніяй «Гродна», «СТВ», «ОНТ» і інш. у галіне літаратуразнаўства і фалькларыстыкі з выступленнямі ў разнастайных тэлеперадачах і здымках сюжэтаў. З 2017 года актыўна друкуецца ў часопісе «Гродна» з навукова-папулярнымі артыкуламі па фальклору Гродзенскай вобласці.

## Пад шатай зжаўцелага дуба…

*Маёй каханай жонцы Марыне*

Пад шатай зжаўцелага дуба,
Прыціснуўшы шлем да грудзей,
Спаў рыцар. Ён ехаў да любай,
Каб стаць на калені хутчэй.

Прыкласціся вуснам да вуснаў
Хацела жывая душа,
І зліцца ў парыве пачуццяў,
Ляцець без канца, без канца.

І сніліся вочы — блакітная бездань,
Чаканне ў іх і туга,
Халодныя ночы, астылыя сцены,
У вокнах густая смуга.

Прыйсці, дакрануцца да цёплага цела,
Застацца — і больш нікуды,
Ахутаць душою гарачае сэрца,
Стаць промнем, агнём назаўжды.

Каб не было больш цяжкога расстання
І бураў у жыцці, навальніц.
Прыйсці й цалаваць да скanaння
Блакітную бездань вялікіх вачніц.

## Не плач

*(верш-суцяшэнне)*

Не плач, Марына, наперадзе ў нас
Жыцця найлепшы час,
Калі мінуць няўдачы і нягоды
І будзе дзень сапраўднае свабоды.

Дыхнем паветрам вольным,
Наперад рушым і дабром напоўнім,
Радасцю аздобім для блізкіх свет,
І станем косткай у горле

Для тых, хто любіць зло,
У каго няма кахання, для каго дабро
Як міф, у які не трэба верыць.
І Бог для нас у рай адчыніць дзверы.

## Кветкі змроку

І зацвітаюць кветкі змроку
У маім жыцці, маёй зямлі,
А ў душы маёй шырокай
Чарнеюць вострыя шыпы.

Шыпы як зброя сіл далёкіх
Праніжуць душу моцай зла,
Самота, крыўда, безнадзейнасць
Падмануць, спапяляць да тла.

Да тла — не значыць да канца,
Бо кветкі зла не зносяць сілы,
Не знішчыць духа чорная імгла
І Бог нас адвядзе ад бездані магілы.

## Замова

*(пародыя)*

Ой, ты Марына, Марына,
Прыгожая дзяўчына,
Блакітныя вочы
У цёмныя ночы
Гараць як агні —
Дык на мяне зірні!
Каб загарэлася
Шчырае сэрца,
Пунцовая кроў,
Патухла —
І ўспыхнула зноў!
Каб ты не спала без мяне,
Як я не магу без цябе,
Каб не ела-піла без мяне,
Як я не магу без цябе.
На сінім моры
Стаіць дуб нахілёны,
На ім кветкі белыя,
Галіны чорныя.
Так і жыццё тваё

Каб было жаноцкае,
Са мною — кветкаю,
З іншым — гнілою трэскаю.
Дзе б ты не йшла,
Думка твая
Пра мяне, малайца,
Заўсёды была!
Станься!!!

## Вядзьмак і дзяўчына

Вядзьмак гукае,
Каханне шукае.
Дзеўка-красуня
Перад ім блазнуе,
Мяркуе, што зачаруе.

Вядзьмак аглушыць,
Чарамі здушыць,
Сэрца змарнуе,
Душу зганьбуе,
Бо моцамі рушыць.

Дзеўка маладзенька,
Спаднічка караценька,
Слёзкі пралівае,
Ведзьмака шукае,
Бо моцна кахае.

Дзяўчына-дурніца,
Ты — не Мілавіца:
З табой размаўляе —
За другой назірае,
Бо яна — ЧАРАЎНІЦА!

## Час

Цік-так,
цік-так,
Крочыць час
скрозь нас.
Цік-так,
цік-так,
Крокам рушым
мы праз час.

Цік-так,
цік-так,
Час бяжыць,
як сыпле мак.
Цік-так,
цік-так,
Цік – не так,
па ўсім так…

## Лабірынт

Асоба чалавека, разумная істота Сусвету,
якую вучылі шмат гадоў ведаць навакольны свет.
Яна ідзе па вузкаму калідору:
паварот налева, паварот направа,
зноў налева, зноў направа.
Тупік. Зноў пошук.
Пошук выйсця? Не,
гэта пошук радасці, сэнсу існасці, боскай асалоды.
Паварот налева, направа, зноў налева. — Дзверы.
Што за імі? Жывая вада?
З жудасным рыпеннем яны адчыняюцца.
А за імі — прыгожая Лялька,
з танклява пышнай фігурай, вялікімі вачыма,
каменным сэрцам, пакрытым ільдом.
Яна абвівае Асобу халоднымі рукамі,
прыціскае да сябе...
І колькі не хукай, не грэй агнём сваёй душы,
не пацячэ вада ад ільда, не растане сэрца...
Калідор, зноў паварот, зноў дзверы... — і
яшчэ адна прыгожая Лялька за імі,
інтэлектуальна-заакуляраная, з кнігай у руцэ
і камп’ютарным сэрцам.
Халодныя рукі і дакладна разлічаныя рухі,
ледзяны пацалунак...
І зноў калідор, і зноў павароты,
і зноў дзверы, і зноў лялькі,
кожная па-свойму каменна-ледзяная;
і зноў пошук.
Нават не пошук, а барацьба
за захаванне агню —
ужо ў сваім сэрцы...

*1994*

## На пасадзе

*(байка)*

Баран патрапіў на пасаду,
А браў яе не ўласнай галавою.
Пабэкаў трохі і ўзяўся сходу
Чыніць разборкі. Ды не ў зуб нагою
Ён разбіраўся ў людзях:
Сяброў падставіў, ворагаў не раз пакрыўдзіў,
Нейтральных жа ў пакутах
Прымусіў "даху" новага шукаць.
Сваёй нікчэмнай галавою
Разлічваў каралём ён стаць.
Але ўладу дурня з кучаравай поўсцю
Братва лясная хутка прыпыніла —
І сёння барановы косці
Бялеюць у лесе.
…………………………
Ніхто больш не бляе пастыла.

*2005*

***

Беларуская нацыя,
Ты — радасць і слёзы,
Ты — сіла і слабасць,
Ты — зямля і нябёсы,
Ты — хрысціянства
І рэшткі паганства.
У табе — плач дзяцей і бацькоў,
У табе — смех малых і старых,
У табе — звон адліг і мячоў,
У табе — мірыяды ўсіх нас.
І з табой — продкі рушылі ў бой,
І з табой — пераступім апошні парог,
І з табой — чуем гук перамог,
І з табой — перад ворагам
станем сцяной!

*2009*

# Зайграў...

*(паводле П.Багрыма)*

Зайграў, зайграў
Хлопча малы
І ў дудачку,
І ў цымбалы.
І паўстала Беларусь
З няволі,
Дачакалася
Добрай долі!
Загарэліся
Ясны вочы,
Не стала больш
Цёмнай ночы.
Незалежнасці
Сонца ззяе,
Лепшым лёсам
Людзей асвятляе!

*2019*

# Мемарыял...

У душы
Паспалітага люду
Ружа чорная —
Гатычны партал,
Магілкі духу,
Звярыны аскал...
Антыкварныя рэчы,
Сэканд-адзенне,
Мовы роднай
Мемарыял...

*2019*

# ПА БІТАМУ ШКЛУ...

*Басанож*
*па бітаму шклу*
*Я іду,*
*не крывянячы ногі...*
*Глядзіце,*
*зайздросце!*
*Я не сыду*
*са змагання дарогі!*

*Р.К.*

***

Трымаю беларускае неба... Як цяжка! Хоць я і адзін з многіх, сярод кпін і насмешак, злосці варажнечай.

Так было і так будзе, як спрадвеку даецца... У барацьбе і змаганні...

За дзяцей і ўнукаў, бацькоў і дзядоў Я БУДУ ТРЫМАЦЬ БЕЛАРУСКАЕ НЕБА!

***

«Пакуль мы шукаем святло, цемра наступае». Многія мяне папракалі за тое, што не шукаю святла. Увесь час Я ЗМАГАЎСЯ З ЦЕМРАЙ!

***

На Нябёсах шмат гавораць пра беларусаў.

– Так многа ім далі: зямлю, рэкі, азёры, лясы і палі, усялякую прыгажосць, вялікую мінуўшчыну...

– Чаго ж ім не хапае?

– Чаму яны не захавалі мову?

– Чаму многія адварочваюцца ад сваёй спрадвечнай культуры і духоўнай спадчыны продкаў?

Не чуюць Нябёсаў беларусы і вешчуноў-празарліўцаў не слухаюць. Толькі трызняць пра грошы, салодкую ежу і напоі, багатую будучыню, зусім забыўшыся – пра вялікую мінуўшчыну.

***

Якія розныя вясковыя людзі! Як мала тых, дабрадушных, з казкамі, легендамі і калыханкамі на вуснах. На змену ім прыйшлі лядачыя перакаці-поле, для каго Радзіма там, дзе віно льецца і грошыкі сыплюцца. І яны яшчэ хваляцца: «Мы вясковыя!» Як быццам дэманструюць, на колькі ўзроўняў падняліся. А насамрэч апусціліся...

Дзе ж тыя дабрадушныя вясковыя людзі? Дзе тыя паданні і песні? Чаму іх так мала? Дзе мілагучная спеўная беларуская мова?

І толькі праходзячы ля магілак разумееш усё!..

***

Божа, як яны палі!.. Без веры ў Цябе, у сябе, ва ўласнае вялікае мінулае; без надзеі на будучыню, у нашчадкаў; без кахання...

Але Ты падштурхнеш іх стаць Вялікім Народам!!! Яны ўспомняць УСЁ – і абудзяцца! Я веру: яны падымуцца!

***

Прынц у казцы пацалаваў непрытомную (у мёртвым сне) прыгажуню – яна прачнулася, Бог удыхнуў душу ў цела чалавека – яно ажыло, Хрыстос сілай Боскай падняў памерлага Лазара.

Дык, Божа, пацалуй зямлю беларускую, каб ажыла і расквітнела, а народ яе прачнуўся!

*2012*

# ПАЗЛЫ

***

Пяцігадовае дзіця ў тэлеперадачы на 23 лютага бачыць дзядзьку палкоўніка, які з выглядам знаўцы робіць сур'ёзную справаздачу і паводле звычкі і для цвёрдасці маўлення, як і многія вайскоўцы, выдзяляе гук «р»:

– Гэты дзядзя мусіць толькі нядаўна навучыўся вымаўляць р-р-р-р. Так стараецца перад іншымі дзядзямі...

***

– Купі парагенератар, – закранае прадавец гандлёвай кропкі ў фае гіпермаркета і расхвальвае свой тавар.

– А нашто мне? – здзіўляюся.

– Няўжо вы не хочаце кінуць курыць?!

– Не хачу!

– Усе хочуць кінуць! – кампетэнтна заяўляе спец па модных парагенератарах.

– А я не! – кажу.

– Чаму? Падумайце пра сваё здароўе!

– Бо я не куру. Таму і не хачу кінуць.

– ?!

– І ніколі не курыў! – яшчэ больш расчароўваю суразмоўцу.

Прадавец застаўся шчыра здзіўлены. Паводле яго меркавання, курацъ і мужчыны, і жанчыны, і падлеткі, а парагенратары – выратаванне, такая панацэя! Толькі купіце!

***

Жанчына, гледзячы кліп рок-гурта на музычным канале, кажа:

– О, горла дзярэ, о, дзярэ!.. І ёй за гэта яшчэ і вялікія грошы плацяць. А як мяне, дык за такое ў пастарунак забралі б...

***

Брыгадзір учора ўзятаму на прадпрыемства рабочаму: «У нас начальнік цэха файны. Праўда, нічога добрага не зрабіў, але ж і кепскага таксама. Цяпер такія людзі рэдкасць!»

***

Калі аднаго майго знаёмага кусаў авадзень, той не скуголіў, а цярпліва павольна заносіў над «мух» руку, лавіў, адрываў акуратненька ногі і адпускаў на волю са словамі: «Ляці, мой харошы! Жыві доўга!» А ў мой бок дадаваў ужо у рэлігійным аспекце: «Не забіў! Граху не ўтварыў!» Своеасаблівая філасофія...

***

У гаворцы сучасных беларусаў можна пачуць шматлікія ўніверсальныя фразы пра жыццё: «каму зараз лёгка?», «як ва ўсіх», «па-рознаму», «неяк так». Своеасаблівая хітрасць ці ўцёк або абарона ад патрэбы падрабязнага тлумачэння?

***

Адстаўны вайсковец, чалавек маленечкага росту, набыў велізарнага сабаку. Кожны вечар яны выходзяць на спацыр. Рэм рвецца наперад, а за ім чыкільдае старэнькі падпалкоўнік. Штораз узнікае думка: «Хто каго выгульвае: гаспадар сабаку ці сабака гаспадара?»

Сабака гаспадара!

***

Стары дзед з зайздроснай рэгулярнасцю ходзіць на гарадскі пляж пазагараць. Напрыканцы чэрвеня стары чалавек ужо загарэлы, «чорны як смоль». Сустрэчныя думаюць, што прыехаў з паўднёвага курорта, а знаёмыя перапытваюць, дзе так адпачыў, у якіх «заграніцах»? І толькі сябры ведаюць, што адзінокі стары мужчына хадзіў на пляж паглядзець на жанчын, пазахапляцца іх прыгажосцю, адчуць, што жыццё вірує. Усё ж такі ён мужчына!

*2018*